### *Литература и источники*

1. Россия. Полное географическое описание. Верхнее Поднепровье и Белоруссия / под ред. В. П. Семенова. — Спб. 1905. — Том 9.

2. Памятная книжка Минской губернии // Издание Минского статистического комитета. — Минск, 1901.

3. Памятная книжка Витебской губернии // Издание Витебского статистического комитета. — Витебск, 1901.

4. Памятная книжка Могилевской губернии // Издание Могилевского статистического комитета. — Могилев, 1901.

5. Памятная книжка Смоленского губернского статистического комитета. — Смоленск, 1901.

## РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА КУЛЬТУРНА-НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХУ НА НЕАКУПІРАВАНАЙ ЧАСТЦЫ БЕЛАРУСІ І НА ТЭРЫТОРЫІ РАСІЙСЬКАЙ ІМПЕРЫІ У 1915-1916 ГОДАХ

***М. Б. Шчаўлінскі***

Пэўнае ажыўленне ў галіне кнігадруку і перыёдыкі на беларускай мове, якое пачалося з 1912 г.і значна садзейнічала развіццю нацыянальнай літаратуры і культуры, на вялікі жаль, было паралізавана Першай сусветнай вайной…

18 ліпеня 1914 г. у заходніх, у тым ліку і ва ўсіх беларускіх губернях, прыфрантавой паласе расійскага Паўночна-заходняга фронту было ўведзена ваеннае становішча. У сувязі з гэтым значныя паўнамоцтвы перадаваліся ў дадзеных месцах у рукі ваенных. Пастановы, выдадзеныя ў гэты час падкрэслівалі, што ўсе асобы, у тым ліку і грамадзянскае насельніцтва «падлягаюць ваеннаму суду і пакаранню па законах ваеннага часу аж да смяротнай казні: 1) за бунт супраць вярхоўнай улады, 2) наўмысны падпал…» [1] і г.д .

У гэтых умовах праводзіць якую-небудь культурна-нацыянальную працу было вельмі цяжка і неспрыяльна.

Набліжэнне расійска-германскага фронту, ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі, дабраахвотныя і прымусовыя ўцёкі сотняў тысяч людзей на ўсход яшчэ больш пагоршылі сітуацыю: восенню 1914 г. вымушаны быў спыніць сваю дзейнасць часопіс «Лучынка», у студзені 1915 г. — «Саха», 30 ліпеня 1915 г. выйшаў апошні нумар газеты «Беларус», а ў жніўні гэтага ж года зачынілася і выдавецтва «Нашай нівы».

Аднак, негледзячы на неспрыяльныя ўмовы — ўвядзенне ваеннага становішча, фізічныя і матэрыяльныя страты, мабілізацыю і бежанства беларуская справа не памерла.

Яшчэ ў пачатку 1915 г. царскі ўрад дазволіў на Беларусі адкрыць яўрэйскі і польскі бежанскія камітэты, а з красавіка 1915 г. пачала працу створаная ў Вільні дабрачынная арганізацыя — «Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны». Яно аб'ядноўвала вакол сябе як католікоў, так і праваслаўных. Старшынёй арганізацыі быў абраны В. Іваноўскі, у склад яе ўваходзілі А. Луцкевіч, В. Ластоўскі, П. Алексюк, І. Біндзюк, У. Сталыгва, І. Буйніцкі і інш. Асноўным зместам работы таварыства было стварэнне пунктаў харчавання, інтэрнатаў, дзіцячых дамоў, аказанне медыцынскай дапамогі бежанцам.

У чэрвені-ліпені 1915 г. «Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны» адкрыла свае аддзелы ў Мінску, Віцебску, Полацку і іншых гарадах.

Пасля акупацыі восеню 1915 г. Заходняй часткі Беларусі, ў тым ліку Вільні гэтыя аддзелы не спынілі сваю дабрачынную працу. Пасля стабілізацыі фронту восенню 1915 г. на лініі Дзвінск — возера Нарач, Баранавічы — Пінск ва многіх гарадах і мястэчках на неакупіраванай частцы Беларусі пачалі дзейнічаць розныя нацыянальныя па форме арганізацыі, у асноўным культурна-асветніцкія. Прыкладам у гэтай справе можна лічыць Мінск, у якім маладая беларуская інтэлігенцыя аб'ядноўвалася ў таварыствы, клубы, гурткі, каб паспрабаваць заявіць пра сябе, свае намеры, здольнасці і планы. Асноўнымі цэнтрамі такіх аб'яднанняў інтэлігенцыі і моладзі былі «беларускія хаткі».

У Мінску «Беларуская хатка» была створана ў пачатку 1916 г. па ініцыятыве Мінскага аддзела «Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны». Яна размяшчалася ў сталоўцы таварыства ў доме пад нумарам 18 на Захар'еўскай вуліцы каля Чырвонага касцёла. У яе рабоце таксама, як і ў працы самога таварыства, бралі актыўны ўдзел Усевалад Фальскі, Аркадзь Смоліч, Лявон Дубейкаўскі, Змітрок Бядуля, Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі), Арнольд Паўловіч, Язэп Фарботка, Рамуальд Зямкевіч, Язэп Лёсік, Фабіян Шантыр, Зоська Верас (Людвіга Сівіцкая), Ванда Лявіцкая. У шматлікіх культурна-асветніцкіх мерапрыемствах, якія рыхтавала і праводзіла «Беларуская хатка», абмяркоўваліся вострыя сацыяльныя і актуальныя праблемы грамадскага і палітычнага жыцця беларускага народа.

Актыўны ўдзел у працы «хаткі» прымаў Максім Багдановіч. У Мінскай губерні «асела» вялікая колькасць уцекачоў. Многія з іх жылі пад адкрытым небам. Паэт, сам будучы цяжка хворы, не шкадаваў сіл, каб аблегчыць долю гэтых людзей. Вось як згадвае той час Аполонія Савёнак: «Ніхто не чытаў нам лекцыяў, не пераконваў, не агітаваў. Гэтыя выдатныя людзі выбралі найвастрэйшую зброю — мастацкае слова. Яны прамаўлялі да нас вуснамі нашых паэтаў-адраджэнцаў. Калі Смоліч дэкламаваў Купалава «Над Нёманам» або Гарунова «Ты, мой брат, каго зваць беларусам…», калі Галубок дэкламаваў гарачыя Купалавы поклічы, калі Лявіцкая дэкламавала цеплыя Цётчыны ды Буйланчыны творы — тут была і любасць да пакрыўджанай Бацькаўшчыны, і слаўная мінуўшчына яе, і пашана да свае мовы. Гэта было для нас і навукай, і клічам, і загадам, і праграмай дзейнасці. Мы бачылі ідэю, ту высокую, вялікую ідэю змагання за волю сваёй Бацькаўшчыны і свайго народу…» [2].

Негледзячы на вайну, беларускія дзеячы неаднаразова ўздымалі пытанне аб адкрыцці на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ўніверсітэта. Напрыклад, у 1916 г. не звяртаючы ўвагі на ваенныя падзеі, амаль што адначасова губернскі земскі сход, Віцебская губернская земская ўправа, Мінская гарадская дума і

Мінскае губернскае земства хадайнічалі перад урадам аб адкрыцці універсітэта ў адным з гарадоў Беларусі. Але Міністэрства Народнай асветы на гэтыя хадатайствы адказавала адмоўна. На погляд Міністэрства, адкрываць універсітэт у Мінску было немэтазгодна таму, што город знаходзіўся паблізу ад фронту, а такія гарады, як Віцебск і Магілёў, не з'яўляліся, згодна ўрадавай тэрміналогіі, цэнтрамі Паўночна-Заходняга краю. Без увагі засталіся і наступныя звароты з тлумачэннямі гарадской інтэлігенцыі да ўлад Магілёва аб адкрыцці ўніверсітэта ў гэтым горадзе.

Відавочна расійскі ўрад, добра разумеючы, якое значэнне для Беларусі мела адкрыццё ў адным з яе гарадоў універсітэта, не імкнуўся станоўча рашыць гэту праблему.

Трэба адзначыць, што падчас вайны працягвала развівацца і беларуская навукова-педагагічная справа. Яна змяшчала разнабаковыя ідэі, прапановы, рэкамендацыі, абагульненi педагагічнага вопыту вучэбных устаноў з беларускіх губерняў. Змястоўнай крыніцай педагагічнага вопыту, здабытага настаўніцтвам Беларусі ў пачатку 20 ст., была кніга А. Шэстава «Навуковая педагогіка і русская школа», выдадзеная у Юр'еве у 1916 г. Прааналізаваўшы і абгульніўшы недахопы вучэбна-выхаваўчага працэсу ў сярэдніх навучальных установах Віленскай вучэбнай акругі, аўтар прыйшоў да высновы, што гэтыя ўстановы не змаглі стаць «самастойнай школай для жыцця», а з'яўляліся толькі «дрэннымі падрыхтоўчымі класамі для вышэйшай школы». У мэтах выйсця вучэбных устаноў з крызіснага стану А. Шэстаў прапанаваў выпрацаваць сістэму выхавання і навучэння на нацыянльнай аснове, галоўную ўвагу надаваць педагагічнай навуцы і асабліва павышэнню яе аўтарытэту ў педагагічным асяроддзі, ажыццявіць збліжэнне школы з сям'ёй і забяспечыць удзел усіх здаровых сіл грамадства ў арганізацыі школьнай сістэмы [3].

Вялікае значэнне, асабліва пасля пачатку Першай сусветнай вайны, стала надавацца фізічнаму выхаванню навучэнцаў. Так, педагагічны сход Мінскага настаўніцкага інстытута 2 мая 1916 г.

прыняў рашэнне аб тым, што на першы план павінна быць пастаўлена фізічнае выхаванне моладзі. Трэба адзначыць, што педагагічная грамадкасць таксама выступала за паляпшэнне прававога і матэрыяльнага становішча педагогаў, патрабавала даць ім большую свабоду ў выкарыстанні розных педагагічных метадаў выхавання навучэнцаў.

Значную культурна-асветніцкую працу ў 1915-1916 гг. праводзіла беларуская інтэлігенцыя па вывучэнню і захаванню помнікаў гісторыі і культуры. Так, у сакавіку 1916 г. у Мінску пры Цэнтральным грамадскім камітэце па ініцыятыве мастака К. Біске быў створаны Аддзел апекі над помнікамі мастацтва і культуры. Члены Мінскага аддзела арганізавалі сховішчы, куды звазіліся калекцыі твораў мастацтва, бібліятэкі, архівы. За кароткі час было сабрана каля 36 000 адзінак захоўвання. Тут знаходзілася больш за 4 000 фотаздымкаў і малюнкаў помнікаў архітэктуры Беларусі. У Мінску па ініцыятыве аддзела ў лістападзе 1916 г. праводзіліся выстаўкі, збор грошай з якіх пералічваўся ў фонд аховы помнікаў [4].

Зазначым, што ў перыяд 1915-1916 гг. пашырылася дзейнасць беларускага культурна-асветніцкага руху ў бежанскіх массах, асноўная частка якіх асела ў цэнтральных губернях Расіі. У многіх расійскіх гарадах — Петраградзе, Саратаве, Казані, Яраслаўлі, Самары і іншых — пачалі ствараццца беларускія бежанскія камітэты, дзе праводзілася культурна-нацыянальная работа. Бежанскія камітэты арганізоўвалі штотыднёвые сходы, на якіх збіраліся беларускія грамадскія дзеячы, студэнты, святары, рабочыя і інш., абмяркоўвалася становішча на Беларусі, чыталіся лекцыі.

Адной з самых актыўных бежанскіх арганізацый было Беларускае таварыства ў Петраградзе па аказанню дапамогі пацярпелым ад вайны. І гэта не дзіўна, бо яе арганізатарамі і кіраўнікамі былі такія дзеячы беларускага адраджэнскага руху, як Б. Эпімах-Шыпіла, Зм. Жылуновіч, Э. Будзько, В. Родзевіч, Я. Кавецкая і інш. Таварыства аказвала дапамогу бежанцам грашыма і рэчамі,

адкрывала інтэрнаты для беларускіх студэнтаў і вучняў, дзіцячыя прытулкі, выдавала лістоўкі з заклікам ахвяраваць грошы для беларускіх бежанцаў, якіх у Петраградзе ў канцы 1916 г. налічвалася 100 704 чал. Спрабуючы аб'яднаць разрозненные бежанскія арганізацыі, Петраградскае таварыства наладзіла цесную сувязь з Мінскім аддзелам «Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны» і імкнулася пашырыць свой уплыў на ўсю тэрыторыю, дзе знаходзіліся беларускія бежанцы. З мэтай далучэння іх да нацыянальна-культурнай працы беларускія дзеячы вырашылі выдаваць газеты «Дзянніцу» і «Светач». Аднак першыя нумары газет выходзілі з вялікімі цяжкасцямі. Напрыклад, калі быў атрыманы дазвол Міністэрства ўнутранных спраў Расійскай імперыі на выданне дзвюх газет, выявілась, што ў цэнзурным камітэце адсутнічаў цэнзар, які б ведаў беларускую мову. У выніку першыя нумары абедзьвух газет выйшлі толькі 1 лістапада 1916 г. Разам з тым цензар Трафімовіч так «шчыра праглядзеў матар'ял», што ў газеце «Дзянніца» поўнасцю захаваліся толькі два артыкулы: Акцюбы (Э. Будзько) «Думкі да граматыкі» і З. Капыляніна (Ц. Гартны) «Аб беларускім універсітэце».

У другім нумары газеты «Дзянніца» захаваўся передавы артыкул, прысвечаны развіццю беларускай нацыянальнай культуры і значэнню перыёдыкі і друку: «Газета і кніжка на роднай мове ясней усяго іншага могуць сведчыць аб культурным росце народа… Цяпер мы яскрава бачым, што яму нельга абысціся без свае газеты, без друкаванага слова. Само жыццё вымушае к гэтаму».

Між тым суровыя цэнзурныя рэпрэсіі супраць «Дзянніцы» паставілі перад рэдакцыяй пытанне: або спыніць выданне газеты, або прыняць неякія выратавальныя захады. Закрываць не выпадала: нягледзечы на белыя цэнзурныя плямы, «Дзянніца» ўсё ж вышла ў свет, яе атрымалі многія бежанцы-беларусы ў розных кутках расійскай дзяржавы, дайшла яна і да чытачоў прыфрантавога Мінска. Акрамя таго, у рэдакцыю пачалі адсюль прысылаць перадаплату і разам гарачыя пажаданні, сталі аднаўляцца так

патрэбныя сувязі паміж бежанскімі арганізацыямі і асобнымі людзьмі. Так, пісьменніца Канстанцыя Буйло пісала ў рэдакцыю: «Жадаць вам хочацца многа… Няхай жа «Дзянніца» і «Светач» асьвечаюць мрокі стогнучай пад цяжарам крывавых дзён старонкі роднай, хай мрок асвеціцца надзеяй, што лепшыя часы недалёка, а на небе, як знак гэтага, хай залунае «Дзянніца», асьвятляючы ўвесь, што ні на ёсць, шырокі прастор краю Беларускага. Хай газеты гэтыя будуць жывым адбіткам душы й думак і ўсяго перажытага народам; хай усё, што жывога ў нас і балючага, адсвеціцца ў іх праменнях, — хай пакажацца на свет; і супольнымі сіламі пастараемся лячыць свае раны, свае балячкі… Шчыра жадаю вытрываласці і еднасці ў працы вялікай»[5].

Пачынаючы з № 3 «Дзянніцы» больш выразна вызначаецца профіль газеты, намячаюцца пастаянныя раздзелы: перадавая, мастацкія творы, артыкулы на актуалныя тэмы, падборкі матэрыялаў «З вайны», «З Літвы», аб’явы, карэспандэнцыі. Газета трымала чытача ў курсе тых падзей, якія адбываліся не толькі ў Петраградзе, але і ў Маскве, Мінску, Яраслаўлі і іншых гарадах. Напрыклад, у артыкуле «З нашага жыцця» гаварылася пра дабрачынную працу Мінскага аддзела «Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны» і пра культурна-нацыянальную працу «Беларускай хаткі». Артыкул заканчваўся зваротам да беларусаў: «…заклікаем усіх свядомых беларусаў аб’яднацца і працаваць, не пакладаючы рук, каб у гэтыя суровыя і важныя часы, калі быць можа, вырашаецца ўвесь далейшый кірунак жыцця нашага Краю, каб быў чутны і наш голас — голас Маладой Беларусі» [6]. Беларускі гісторык В. Скалабан шляхам тэксталагічнага аналізу ўстановіў, што зварот і ўвесь артыкул напісаў М. Багдановіч, які падпісаўся псеўданімам М. Осьмак.

Аднак у хуткім часе супраць ажыўлення беларускага культурна-нацыянальнага руху выступілі расійскія рэакцыйныя сілы. З маўклівай згоды дзяржаўных кіраўнікоў пачалося сістэматычнае прад’яўленне прэтэнзій да газеты. Цэнзура здымала амаль усе матэрыялы, якія датычыліся становішча Беларусі, беларускага

адраджэння. У выніку 31 снежня 1916 г. беларуская газета «Дзянніца» вымушана была спыніць сваё выданне

Прыкладна такі ж лёс напаткаў і другую беларускую газету — «Светач». Негледзячы на сваю «умеранасць» — на старонках газеты ў першую чаргу ўздымаліся пытанні развіцця беларускай вёскі і сялянскага побыту — «Светач» таксама з-за цэнзурных патрабаванняў і ганенняў з боку рэакцыйных сіл спыніў дзейнасць.

Тым ня менш «Дзянніца» і «Светач», якія выходзілі на працягу двух месяцаў, пакінулі прыкметны след, у першаю чаргу, сярод беларускіх бежанскіх масс.

Такім чынам, развіццё культурна-асветніцкага руху на неакупіраванай частцы Беларусі і на тэрыторыі Расійскай імперыі у 1915-1916 гг. дасягнула значных поспехаў.

### ***Крыніцы і літаратура***

1. НАРБ. — Ф. 705. — Воп. 1. — Спр. 27.

2. Савёнак, А. Калісьці ў Мінску / А. Савёнак // Беларуская мова і літаратура ў школе. — 1991. — № 12.

3. Снапкоўская, С. В. Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі / С. В. Снапкоўская. — Мн., 1995.

4. Дзянісаў, У. З гісторыі аховы помнікаў / У. Дзянісаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. —1984. — №. 3.

5. Буйло, К. Пісьмо ў рэдакцыю / К. Буйло // Дзянніца. — 1916. — 27 лістапада.

6. Осьмак, М. З нашага жыцця / М. Осьмак // Дзянніца. — 1916. — 27 лістапада.